*Г. В. Кажамякін*

# РЭДКАЯ КНІГА: ДА ПЫТАННЯ ЗАХОЎВАННЯ І ВЫВУЧЭННЯ

Такая праблема, як захоўванне і вывучэнне рэдкіх выданняў, паўстала даўно, але толькі ў апошнія дзесяцігоддзі ў шэрагу бібліятэк не толькі галаўных, дзяржаўных, але нават і навучальных установ сталі адкрывацца аддзелы рэдкай кнігі, асноўнай функцыяй якіх, несумненна, з’яўляецца менавіта ашчаднае, рупнае захоўванне каштоўных гістарычных, антыкварных бібліятэчных рарытэтаў.

Сёння можна смела сцвярджаць, што паняцце *рэдкая кніга* сталася асобнай галіной бібліятэказнаўства. Гэта таксама і такая праблема, якая можа выклікаць цікавасць у гісторыкаў, архівістаў, філолагаў, культуролагаў, музеязнаўцаў. Але ў сувязі з тым, што такі кірунак яшчэ недастаткова даследаваны і патрабуе тэарэтычнага і практычнага абгрунтавання, часам у бібліятэчных колах паўстаюць спрэчкі пры вызначэнні сутнасці тэрміну *рэдкая кніга*. У тэарэтычнай літаратуры часоў СССР адзначаецца: «Традиционное понятие Р.к. весьма условно, его содержание до сих пор вызывает споры. Р. к. имеет более узкие по содержанию синонимы – библиографическая редкость, раритет, уникальная книга» [2, с.440].

У артыкуле падаюцца два значэнні тэрміну. Паводле першага, рэдкасць кнігі вызначаецца праз яе невялікі наклад; паводле другога – такі статус выданню надаюць яго знешнія асблівасці, напрыклад аўтографы, каштоўнае афармленне і да т. п. З часу выдання энцыклапедычнага слоўніка шмат змянілася ў плане захоўвання і вывучэння рэдкіх кніг, і пададзенае тут вызначэнне ўжо не можа задавальняць спецыялістаў.

У дадзеным артыкуле бярэцца пад увагу перш за ўсё ўстойлівы ў практыцы бібліятэчнай справы храналагічны крытэрый для вызначэння паняцця *рэдкая кніга*, пры якім маюцца на ўвазе друкаваныя выданні, што выйшлі ад пачатку кнігадруку да часу па сканчэнні Другой сусветнай вайны, а таксама рукапісныя кнігі. Такія бібліятэчныя дакументы займаюць галоўнае месца ў аддзелах рэдкай кнігі. Часам да рэдкіх кніг адносяць факсімільныя выданні і асобнікі, якія выйшлі пазней, але маюць такія рарытэтныя асаблівасці, як аўтографы славутых асоб, цікавыя штампы, экслібрысы і да т. п. Тут, несумненна, можа паўстаць пытанне, чаму

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

мы называем шэраг каштоўных бібліятэчных дакументаў, сярод якіх не толькі кнігі, але і часопісы, газеты, рукапісы і іншыя матэрыялы, *рэдкая кніга.* Вядома, што такое вызначэнне досыць умоўнае, яно ўжываецца як устойлівы выраз у назвах аддзелаў бібліятэк – аддзел рэдкай кнігі. Але, нібы ўсведамляючы сэнсавую вузкасць такога паняцця, у некаторых кніжніцах адпаведныя структуры названыя крыху інакш. Напрыклад, у Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь існуе аддзел старадрукаў і рэдкіх выданняў.

Галоўная праблема рэдкай кнігі, якая сёння хвалюе бібліятэкараў, – захаванасць каштоўных рарытэтаў. У сувязі з гэтым паўстаюць пытанні: ці можна аднавіць такі бібліятэчны антыкварыят? Калі можна, дык у якой ступені і на якім узроўні, пры дапамозе якіх сродкаў? Як вядома, доўгія гады ў бібліятэках актыўна рэстаўрыраваліся кнігі прынамсі XIX–XX стст. Трэба памятаць, што нават сярод каштоўных для нас сёння вокладак кніг ёсць і неарыгінальныя, зробленыя крыху пазней. Напрыклад, кніга надрукаваная ў канцы XIX ст., а новы пераплёт – у пачатку XX ст. Пазнейшыя вокладкі рабіліся часам з выкарыстаннем мастацкага аздаблення, нават на форзацы. У такім выпадку часам вокладка або форзац могуць набыць большую каштоўнасць, як унікальная рэч. Так можа паўстаць і даследчыцкая зацікаўленасць у вывучэнні гісторыі і асаблівасцей пераплёту кніг, напрыклад, перыяду 20–30-х гг. у Савецкім Саюзе. Пры гэтым можна вызначыць, якія існавалі малюнкі на кнігах, форзацах, дзе, у якім месцы яны рабіліся. Тады ж з’яўляецца і магчымасць падобнай антыкварнай экспертызы. Калі сёння здзяйсняць такі антыкварны рамонт-рэстаўрацыю, трэба на форзацы ставіць адмысловы штамп, дзе мусяць адбівацца звесткі, хто, дзе і калі зрабіў новую «аправу». Гэта важна, каб не ашукаць даследчыкаў прышлых пакаленняў. Гэтак амерыканскі навуковец-даследчык Пол Бэнкс адзначае: «Калі ўзровень рэстаўрацыйнай працы вельмі высокі і кніга практычна не розніцца ад арыгіналу, гэта толькі можа ўвесці ў зман навукоўцаў будучыні» [1, с.70].

Аўтар лічыць, што рэстаўрацыя рэдкай кнігі крайне непажаданая і выступае за кансервацыю дакумента. П. Бэнкс сцвярджае: «Калі ж фізічнае ўмяшальніцтва прызнана непазбежным, дык мусяць прымяняцца метады, якія захоўваюць як мага болей магчымасцей для аналізу кнігі ў будучыні. Апрацоўка павінна найменей змяняць кнігу і рабіцца толькі з мэтай забеспячэння захаванасці аб’екта ў тых умовах, у якіх ён захоўваецца і выкарыстоўваецца. Гэта

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

тычыцца як хімічнай (дэзынфекцыя, раскісленне), гэтак і механічнай (падклейка і перапляценне) апрацоўкі» [1, с.72].

Несумненна, што абсалютна без рэстаўрацыі абысціся немагчыма, хаця б таму, што інкунабулы, кнігі, рукапісы, іншыя дакументы ў выніку старэння матэрыялу часам схільныя да гніення, рассыпання, крышэння… П. Бэнкс, як бачна, згадвае хімічную рэстаўрацыю. Сапраўды, пры рэстаўрацыі кнігі, газеты мы не можам абысціся без некаторых хімічных рэчываў, якія выкарыстоўваюцца дзеля захавання паперы, вокладкі, уратавання ад рассыпання, гніення, грыбковага паражэння, пашкоджання паразітамі… Напрыклад, састарэлая скура «аправы», здольная да трэскання, рассыпання, можа пасля адпаведнай хімапрацоўкі, насычэння яе змякчальным рэчывам набыць «новае жыццё», «амаладзіцца». У свой час пытанне пра падобную хімрэстаўрацыю ставілі беларускія хімікі з Гомеля, але пазней такая ініцыятыва не атрымала працягу. Вядома, што тут паўстае і фінансавая праблема. Несумненна, што ў перспектыве магчыма нават з'яўленне спецыялізацыі, звязанай з рэдкай кнігай, вывучэнне асноў хімічнай апрацоўкі і рэстаўрацыі дакумента.

Вельмі асцярожным трэба быць з абразаннем кніг, газет, часопісаў пры іх пераплёце. Трэба памятаць, што на некаторых кнігах канца XIX – пачатку XX ст. існавалі «залачоныя абрэзы», г. зн. залатое пакрыццё абрэзу, мэтай якога было і ўпрыгожыць кнігу, і абараніць пакрытае месца ад зношвання. Існавалі таксама так званыя мармуровыя і арнаментальныя абрэзы. І цяпер іх крайне важна захаваць як гістарычна каштоўную дэталь рэдкай кнігі. Часам пры пераплёце газет адбываецца абразанне краю аркуша разам з тэкстам, што недапушчальна: гэта можа быць унікальны асобнік.

Некаторыя аддзелы рэдкай кнігі могуць таксама захоўваць у фондах рэдкія паштоўкі, буклеты, плакаты або грампласцінкі. Гэтак у фондзе названага аддзела Прэзідэнцкай бібліятэкі захоўваюцца і паштоўкі. Нельга забываць, што грампласцінкі былі, напрыклад, складнікам савецкага часопіса «Кругозор», а таксама прыкладаліся да рознага роду кніжных выданняў, такіх, як альбомы, навучальныя дапаможнікі па замежнай мове. Калі браць пад увагу, што ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь знаходзяцца і гуказапісы на розных носьбітах, мы можам ставіць пытанне і пра магчымае захоўванне ў аддзелах рэдкай кнігі старых грампласцінак перыяду грамафонаў, патэфонаў з хуткасцю пракруткі каля 78

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

абаротаў. Трэба мець на ўвазе, што і на такіх гістарычных дакументах часам захоўваюцца запісы літаратурных твораў (вершаў, фрагментаў прозы), галасоў пісьменнікаў, а гэта своеасаблівая антыкварная каштоўнасць дапамагае ўзбагаціць фонд аддзела. Кніга ж адыгрывае ролю ў пэўнай ступені і музейнага экспаната. Таму побач з кнігамі ў афармленні інтэр'еру памяшканняў часам з'яўляецца і антыкварыят іншага кірунку. Так аддзел рэдкай кнігі нават стварае музейную экспазіцыю, дзе рэдкая кніга арганічна спалучаецца з роўнымі ёй па часе прадметамі гісторыі. Наведвальнік праз гэта ўсведамляе, у якой атмасферы існавала кніга. І калі ён падчас спецыяльнай экскурсіі па аддзеле ўбачыць патэфон ці нават грамафон, адначасова пачуе з такога экспаната гук, дык абавязкова атрымае эстэтычнае задавальненне і дакранецца да гісторыі. Іначай кажучы, аддзел рэдкай кнігі выконвае ў пэўнай ступені і функцыю музея кнігі пры адсутнасці такой асобнай структуры ў бібліятэцы. Тым больш аддзелы павінны дэманстраваць тыповыя найкаштоўнейшыя рарытэты або праводзіць тэматычныя выстаўкі рэдкай кнігі.

Асобная тэма захоўвання і вывучэння рэдкай кнігі – канвалюты. Як вядома, канвалют можа быць як выдавецкім, гэтак і самаробным. Часам у аддзелы рэдкай кнігі трапляюць такія цікавыя асобнікі. Несумненна, што яны таксама маюць сваю каштоўнасць як унікальныя дакументы. Бадай, найбольшую цікавасць могуць выклікаць канвалюты з прыватных кнігазбораў вядомых асоб. Напрыклад, у аддзеле рэдкай кнігі БДПУ імя Максіма Танка паміж кніг з бібліятэкі Янкі Ліманоўскага (беларускага пісьменніка XX ст.) маецца і такі канвалют: пераплеценыя разам творы літаратуры народаў Усходу. Гэта два асобныя выданні – Ляо Чжай. Избранные рассказы. Т. 1: Лисьи чары. Петербург, 1922; Ибн Туфейль. Роман о Хайе, сыне Якзана. Петербург, 1920. Першае належыць да кітайскай літаратуры, другое – да арабскай. Так некаторыя даследчыкі – літаратуразнаўцы, гісторыкі могуць праз вывучэнне канкрэтных канвалютаў высветліць некаторыя моманты светапогляду першага ўладальніка, на якія каштоўнасці ён арыентаваўся, калі браў у адну аправу розныя выданні. З прыведзенага намі прыкладу бачна, што цікавіла Янку Ліманоўскага, як ён тэматычна паводле разумення Усходняга рэгіёну аб'яднаў у адзін канвалют такія творы. Акрамя таго, зразумела, што калі тут пераплецены толькі першы том Ляо Чжая,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

дык, відаць, гэты том у яго кнігазборы адзін. Пры даследаванні і бібліяграфічным апісанні рэдкага выдання вельмі важна высветліць, ці гэта не канвалют, каб не дапусціць памылку ў апісанні асобніка як аднога выдання. Нумарацыя ж старонак тут не скразная, але пры пераплёце некаторых частак тамоў, выпускаў, што выходзілі ў мяккай вокладцы і часцей браліся ў бібліятэцы ў адну аправу, нумарацыя часта была менавіта скразной. Паколькі ў асобныя выпускі ўваходзіла пэўная колькасць друкаваных аркушаў, якія трэба было яшчэ і разрэзаць, а перанос слова прыходзіўся на іх стык, дык і сам выпуск пачынаўся часам з пераносу. Здараецца, цяжка пры вывучэнні такіх аб'яднаных тамоў вызначыць, дзе былі асобныя часткі, і выпадкова захаваныя экзэмпляры такіх частак становяцца асабліва каштоўнымі рэчамі.

Калі ўвогуле гаварыць пра далейшае развіццё навуковай галіны, якая даследуе праблематыку захоўвання і вывучэння таго, што мы ўмоўна называем рэдкай кнігай, варта прызнаць, што, прынамсі, на тэрыторыі Беларусі, некаторых іншых краін постсавецкай прасторы адсутнічае тэарэтычнае навуковае, а таксама вучэбнае выданне, у якім належным чынам было б разгледжана дадзенае пытанне. Публікацыі асобных даследчыкаў у зборніках навуковых канферэнцый, газетах, часопісах выглядаюць разрознена. Таму сёння існуе патрэба напісання і выдання агульнага дапаможніка для студэнтаў, спецыялістаў, навукоўцаў. Аўтарамі такога выдання могуць стаць як выкладчыкі, так і тыя, хто працуе з рэдкімі выданнямі ў бібліятэцы, а таксама архівазнаўцы. У такім выпадку наша краіна магла б нават стацца першай, дзе б падобны дапаможнік пабачыў свет.

---

1. *Бэнкс, П.* Ответственность перед будущими поколениями / П. Бэнкс // Библиотекарь. – 1991. – № 4. – С. 69–72.

2. *Книговедение:* энцикл. словарь. – М., 1982.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ